УДК 821.161.3

**А. М. Чарнавокая**
Дзяржаўная навуковая ўстанова «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», вул. Сурганава, 1, корп. 2, 220072 Мінск, Рэспубліка Беларусь, +375 (29) 269 47 92, lecsa87@gmail.com

# МАТЫВЫ БАРАЦЬБЫ І СУПРАЦЬСТАЯННЯ Ў СУЧАСНЫМ БЕЛАРУСКІМ ФЭНТЭЗІ

Упершыню праводзіцца параўнальна-тыпалагічны агляд твораў А. Длатоўскай, К. Захарэвіч, М. Латышкевіч, С. Мінскевіча, М. Шабанец, Н. Ясмінскай, А. Жвалеўскага і Я. Пастэрнак, адрасаваных дзецям і падлеткам. Ключавое сюжэтаўтваральнае значэнне ў гэтых творах маюць матывы барацьбы і супрацьстаяння, што абумоўлена канфліктам добрых і злых сіл. Выяўленне спецыфікі рэалізацыі гэтых матываў дазваляе вызначыць прынцыпы супрацьпастаўлення персанажаў, акрэсліць асаблівасці ўзаемадзеяння дабра і зла, раскрыць гуманістычны патэнцыял жанру фэнтэзі. Робіцца выснова, што ў большасці твораў цэнтральны канфлікт абумоўлены канфрантацыяй людзей і фантастычных істот. Частотнымі з'яўляюцца матывы вайны, бітвы, зняволення, здрады, хваробы, сяброўства, дапамогі, ратавання. Аўтары сцвярджаюць важнасць высакародства, сумленнасці, спагады, таварыскасці. Дабро і зло паўстаюць у фэнтэзі з'явамі менш кантраснымі, чым у народнай казцы.

**Ключавыя словы:** падлеткавая проза; аксіялогія літаратуры; беларуская міфалогія; С. Мінскевіч; М. Латышкевіч; Н. Ясмінска.
Бібліягр.: 18 назваў.

**A. M. Charnavokaya**
State Scientific Institution "Center for Research of Belarusian Culture, Language and Literature of the National Academy of Sciences of Belarus", 1 Surganova Str., build. 2, 220072 Minsk, the Republic of Belarus, +375 (29) 269 47 92, lecsa87@gmail.com

# MOTIFS OF STRUGGLE AND CONFRONTATION IN MODERN BELARUSIAN FANTASY

The first comparative-typological review of the works of A. Dlatovskaya, K. Zakharevich, M. Latyshkevich, S. Minskevich, M. Shabanets, N. Yasminska, A. Zhvalevsky and E. Pasternak, addressed to children and adolescents, is conducted. The motives of struggle and confrontation are of key plot-forming importance in these works, because of the opposition of good and evil forces. The identification of the implementation of these motives allows to determine the principles of the characters' juxtaposition, outline the features of the interaction of good and evil, reveal the humanistic potential of the fantasy genre. It is concluded that in most works the central conflict is caused by the confrontation of people and fantastic creatures. The motives of war, battle, imprisonment, betrayal, illness, friendship, help and salvation are frequent. The authors state the importance of nobility, honesty, responsiveness, sociability. Good and evil in fantasy are less contrasting phenomena than in a folk fairy tale.

**Key words:** teenage prose; axiology of literature; Belarusian mythology; S. Minskevich; M. Latyshkevich; N. Yasminska.
Ref.: 18 titles.

Репозиторий БарГУ

**Уводзіны.** Фэнтэзі — адзін з самых папулярных жанраў мастацкай прозы XXI стагоддзя. Паводле вызначэння М. У. Амон, галоўнымі прыкметамі гэтага жанру з'яўляюцца: «мадэляванне "іншага" свету з падрабязнай распрацоўкай хранатопа выдуманай краіны; зварот да звышнатуральнага розных узроўняў (магіі, містыкі, рэлігіі і г. д.) як сродку ідэнтыфікацыі героя; літаратурная гульня з "чужым тэкстам" (ад выкарыстання пэўных фальклорных і міфалагічных сюжэтаў да працы з вядомымі творамі-фэнтэзі)» [1, с. 11].

Фэнтэзі як адзін з жанраў фантастыкі актыўна развіваецца і ў беларускай літаратуры. Многія сучасныя творы фэнтэзі адрасаваны чытачам-падлеткам (узроставыя групы: 12+, 16+): проза М. Латышкевіч, С. Мінскевіча, М. Шабанец, Н. Ясмінскай, А. Жвалеўскага, Я. Пастэрнак і інш. Іх асобныя творы аналізаваліся Т. Пятроўскай [2], М. Крыловай [3], Т. Сідаравай [4]. Аднак у параўнанні з жанрамі казкі і падлеткавай аповесці фэнтэзі для дзяцей і падлеткаў амаль не вывучалася айчыннымі літаратуразнаўцамі.

© Чарнавокая А. М., 2025

**Матэрыялы і метады даследавання.** Прадметам даследавання з’яўляецца сістэма матываў сучаснага беларускага фэнтэзі для дзяцей і падлеткаў. Як адзначаюць Т. Н. Брэева і Л. Ф. Хабібуліна [5, с. 145], В. І. Караткевіч [6, с. 121], фэнтэзі бярэ пачатак у фальклоры, чароўнай казцы, рыцарскім рамане. І. У. Лебедзеў [7, с. 15—17] і С. А. Гогалева [8, с. 85] дадаюць у гэты пералік авантурную аповесць і авантурны раман, у якіх ключавая сюжэтаўтваральная роля належыць матывам барацьбы і супрацьстаяння. Адпаведна, «для фэнтэзі, як і для рыцарскага рамана ці прыгодніцкай аповесці ўласцівыя… этычная кантраснасць дабра і зла, заўсёды актыўны герой. <…> Дабро і зло тут заўсёды персаніфікаваны, і хаця першае не абавязкова перамагае, другое абавязкова будзе выкрыта, бо герой рэалізуе сябе толькі ў гэтым супрацьстаянні» [7, с. 19]. Такім чынам, характэрным для фэнтэзі з’яўляецца супрацьстаянне добрых і злых сіл, што адзначаюць многія літаратуразнаўцы: В. І. Караткевіч [6, с. 122], С. А. Гогалева [8, с. 85], І. У. Лебедзеў [7, с. 18], Т. Н. Брэева і Л. Ф. Хабібуліна [5, с. 6]. Гэта актуалізуе матывы саперніцтва, змагання, вайны, бітвы, пераследу, помсты, зняволення.

Аб’ектам даследавання з’яўляюцца аповесці С. Мінскевіча «Усмешка Жалобнай Каралевы, альбо Таямніца магнітнага замка» (2013), К. Захарэвіч «Час Вогненнага Птушкалова» (2018), М. Шабанец «Пасланцы Цмока» (2022), Н. Ясмінскай «Заклінальнік аднарогаў» (2023), «вугеркаўскі» цыкл М. Латышкевіч («Трыснёг пад ветрам» з кнігі «Уласны крыж» (2021), «Лісіны пярсцёнак» (кніга на рускай мове, 2021), «Першая песня», «Над Вугерай — дождж», «Вараціш-гара», «Вершнікі на дарозе» з кнігі «Вершнікі на дарозе» (2022)). Гэтыя творы адпавядаюць асноўным патрабаванням да жанру фэнтэзі. Падзеі адбываюцца ў чароўным свеце, дзе цуды і дзівосы — норма існавання. Чытачу даводзіцца разам з героямі адкрываць законы і таямніцы прыдуманай аўтарам рэчаіснасці. Вялікае значэнне мае канструяванне, мадэляванне фантастычнай краіны — апісанне яе геаграфіі, гісторыі, сацыяльнай структуры, палітычнай сітуацыі і г. д.

У артыкуле таксама аналізуюцца раман-казка А. Жвалеўскага і Я. Пастэрнак «Гімназія № 13» (2010) і аповесць А. Длатоўскай «Арнаменты» (2019), дзе месцам дзеяння паўстае сучасны Мінск. Уварванне міфалагічных персанажаў змяняе звыклую рэчаіснасць, пачынаючы з «адмены» базавых законаў фізікі, у тым ліку прынцыпаў прастора-часавага ўзаемадзеяння. Звыклая рэчаіснасць быццам знікае, падзеі адбываюцца ў вядомым локусе, але нібыта ў асобным свеце, які на пэўны час з’явіўся на скрыжаванні розных энергетычных патокаў. Такім чынам, творы А. Длатоўскай, А. Жвалеўскага і Я. Пастэрнак разглядаюцца ў гэтым артыкуле як фэнтэзі.

У працы выкарыстоўваюцца параўнальны і аналітычны метады. Цэнтральным з’яўляецца прынцып цэласнага вывучэння мастацкага твора ў цесным узаемадзеянні з сістэмна-структурным і ідэйна-кампазіцыйным метадамі даследавання. Метадалагічная аснова — тэарэтычныя распрацоўкі па матыўным аналізе тэксту.

Пры аналізе і супастаўленні твораў мы абапіраемся на вызначэнне матыву, прапанаванае І. В. Сіланцьевым: матыў — гэта «эстэтычна значная адзінка аповеду, інтэртэкстуальная ў сваім функцыяніраванні, інварыянтная ў сваёй прыналежнасці да мовы апавядальнай традыцыі і варыянтная ў сваіх падзейных рэалізацыях; якая суадносіць у сваёй семантычнай структуры прэдыкатыўны пачатак дзеяння з актантамі і прасторава-часавымі прыкметамі» [9, с. 96]. Пры супастаўленні мастацкіх твораў актуальнай з’яўляецца тэматычная трактоўка матыву, распрацаваная А. Н. Весялоўскім і Б. В. Тамашэўскім: «У параўнальным вывучэнні матывам называюць тэматычнае адзінства, якое сустракаецца ў розных творах. <…> матывы цалкам пераходзяць з адной сюжэтнай канструкцыі ў другую. У параўнальнай паэтыцы не важна — ці можна іх раскласці на больш дробныя матывы. Важна толькі тое, што ў межах дадзенага жанру, які вывучаецца, гэтыя “матывы” заўсёды сустракаюцца ў цэласным выглядзе» [10, с. 137].

**Вынікі даследавання і іх абмеркаванне.** Персанажаў фэнтэзі можна падзяліць на дзве катэгорыі — людзі і фантастычныя істоты, сярод якіх вылучаюцца міфалагічныя персанажы і не-людзі — героі, падобныя да людзей, але надзеленыя надзвычайнымі здольнасцямі. У большасці прааналізаваных твораў супрацьстаянне людзей і фантастычных істот вызначае

Рэпазітарый БарДУ

цэнтральны канфлікт. У рамане-казцы А. Жвалеўскага і Я. Пастэрнак «Гімназія № 13» дзеці прыходзяць увечары ў школу, каб дапамагчы будаўнікам знішчыць старажытны дуб. Запланаваны выбух не адбываецца, затое шасцёра школьнікаў застаюцца замкнёнымі ў будынку, дзе час спыніўся, а замест настаўнікаў і работнікаў установы апынуліся незвычайныя істоты. Яны невялікія, увішныя, любяць пачастункі, нагадваюць дамавікоў і маюць імёны, якія адпавядаюць месцажыхарству: Сталоўнік, Спортзальнік, Бібліятэкавік і г. д. Пазней у школе з'яўляюцца Пярун разам з галоўнымі славянскімі язычніцкімі багамі і Паляндра-Кашчэй, якая ўзначальвае чорнае войска. Высвятляецца, што школьны дуб — не проста адметная расліна, а «дрэва свету, цэнтр светабудовы» [11, с. 318], увасабленне жыццёвай прасторы, за якую спрадвеку змагаюцца злыя і добрыя сілы. Вучні імкнуцца пераадолець чары і аднавіць нармальнае жыццё, каб выратавацца з зачыненай школы. Гэта вызначае супрацьстаянне паміж імі і фантастычнымі істотамі. Дзецям даводзіцца разгадваць таямніцы, вырашаць складаныя пытанні, разбірацца ў славянскай міфалогіі. Вялікае значэнне маюць вынаходлівасць, праніклівасць, кемлівасць, таварыскасць вучняў.

Галоўныя героі чароўнага свету С. Мінскевіча — хлопец Арцін, дзяўчына Алеола і мастак Дроздзіч — дамаўляюцца выратаваць людзей ад Жалобнай Каралевы, уладаркі гора і смутку Паляндры, якая забрала ў вязніцу жыхароў роднай вёскі Арціна і Алеолы. Каралева прагне людскога гора і харчуецца вусенямі, што заводзяцца на балотных купах вакол вязніцы, бо зняволеныя людзі «сілкуюць балотную зямлю сваім горам» [12, с. 11]. Героі выпраўляюцца на далёкую выспу, каб здабыць ягады шчасця з чароўнага дрэва ядвабніцы і знішчыць чары Паляндры. Асноўная ўвага надаецца іх прыгодам і новым знаёмствам юнакоў.

У аповесцях М. Латышкевіч фантастычныя істоты — гэта не-людзі, здані, цмокі, у большай ці меншай ступені небяспечныя для людзей. Не-людзі, або народ курганоў, — князі, паляўнічыя, ваяры, музыкі, паэты, высакародныя панны — знешне адрозніваюцца ад людзей толькі «даўнімі і мудрымі» [13, с. 8], «вогненнымі» [13, с. 11] вачыма і ледзь прыкметнымі асаблівасцямі аблічча. Не-людзі валодаюць чарамі, існуюць у іншым вымярэнні, але ў прошчах могуць выходзіць на зямлю. Самае жахлівае для чалавека — гэта Дзікі Гон — «збройныя вершнікі на чале з неміласэрным Князем Зімы» [13, с. 9], уладаром народу курганоў. Дзікі Гон «нясецца па пустках, па палях і лясах, не разбіраючы дарогі, і каго са смяротных напаткае — таму не жыць» [13, с. 9]. Не-людзі могуць несці пагрозу для чалавека, але часам прыходзяць на дапамогу.

Людзі і народ курганоў неаднойчы сыходзіліся ў бітвах за абшары зямлі, што вызначае варожасць паміж імі. Але ў людзей і не-людзей ёсць агульны вораг — здані, якія жывуць у пакінутых прошчах і робяць іх небяспечным. Змаганне са зданямі, у якім удзельнічаюць людзі і не-людзі, — цэнтральная падзея ў аповесцях «Першая песня» і «Трыснёг пад ветрам». Наступная магутная фантастычная істота — гэта цмок, які, згодна з фальклорнай традыцыяй, нясе зло і разбурэнне. У аповесцях «Над Вугерай дождж» і «Лісіны пярсцёнак» кульмінацыяй паўстае бітва чалавека з цмокам, у якой першый перамагае дзякуючы дапамозе не-людзя.

Супрацьстаянне людзей і не-людзей мае месца і ў постмадэрновай аповесці К. Захарэвіч, аднак агрэсарам паўстаюць тут людзі. У творы развіваюцца дзве сюжэтныя лініі. Галоўная гераіня — сучасная трынаццацігадовая дзяўчынка Леся — жыве разам з маці і сястрой, разважае над стасункамі бацькоў, трымае ў кватэры папугая Бяляшыка і ката Персіка, вучыцца ў школе. Дзяўчынка атрымлівае ў падарунак набор «Ідэальны свет» — «120 непаўторных лялек», з якімі можна «пабудаваць сапраўдную цывілізацыю» [14, с. 5]. Прыдуманае Лесяй жыццё лялек, на якое праецыруюцца праблемы дзяўчыны і яе стасункі з аднакласнікамі, больш насычанае і цікавае, чым яе ўласнае існаванне.

У лялечным свеце людзі варагуюць з адметнымі — прыгожымі, несмяротнымі, таленавітымі, больш дасканалымі і дасціпнымі за іх. 120 адметных маюць невялікую дзяржаву, куды трапляе Бася — галоўная гераіня лялечнай гісторыі, дачка звычайнай жанчыны і «адметнага». Стасункі паміж светам людзей і паселішчам адметных надзвычай складаныя і заблытаныя. Людзі палююць на адметных, успрымаюць іх як злачынцаў, але варожасць мае простую прычыну: кіраўніку трэба мець вінаватага ў праблемах сваёй краіны.

Рэпазіторый БарДУ

Значная ўвага надаецца знешняй і ўнутранай палітыцы, стасункам кіраўнікоў. Адметныя пачынаюць сыходзіць з жыцця канчаткова не столькі праз страх за сваё існаванне, колькі праз «цяжар» несмяротнасці і непаразуменні ў дзяржаве. Аднак у свеце, дзе Бяляшык паўстае Нябёснай Птушкай — сімвалам гармоніі і шчасця, а Персік — варожым Вогненным Птушкаловам, дэманструецца іранічнае стаўленне да палітычных інтрыг, якія пазіцыянуюцца як locus communis у фэнтэзі-прозе.

У аповесці А. Длатоўскай «Арнаменты» супрацьстаянне дабра і зла мае касмічныя маштабы. Сусвет створаны богам Перуном, а падтрымліваюць лад у ім навальнічнікі — нашчадкі старажытнага боства, якія павінны абараняць людзей ад пачвар і нячысцікаў. Усе ваяры-навальнічнікі былі дзецьмі, у якіх рана абудзіліся незвычайныя здольнасці. Такіх дзяцей заўважаюць і забіраюць у адмысловую школу, дзе вучаць магіі. Апісанне дзейнасці ўстановы чаргуецца з аповедамі пра сутыкненні мінчукоў з беларускімі нячысцікамі: лесуном, лохвай, апіўнем, ліхаманкай ды іншымі. Сустрэчы адбываюцца занадта часта і маюць трагічны фінал, калі навальнічнікі не паспяваюць выратаваць ахвяру. Ваяр Усевалад падазрае вялікую небяспеку і выклікае на дапамогу ўсю каманду навальнічнікаў.

Адна з прычын нашэсця нячысцікаў — глабальныя змены ў свеце: «Людзі перасталі баяцца, перасталі шанаваць прыроду» [15, с. 191]. Знішчэнне лясоў і рэк, знікненне вёсак — страта жытла для гаёўкі, хута, вешчыцы... Развіццё навукі і тэхнікі, імклівая ўрбанізацыя паўстаюць злом, якое парушае баланс энергіі. Паводле шэрагу характарыстык твор блізкі да экапрозы. Можна адзначыць пабудову калізіі ў межах сістэмы «чалавецтва супраць прыроды», зварот да экалагічнай тэматыкі, апакаліптычнае/трагічнае светаадчуванне [16, с. 26].

Як і ў аповесці К. Захарэвіч, у фінале адбываецца маштабная бітва паміж варожымі сіламі, падчас якой высвятляюцца намеры галоўных герояў і прычыны супрацьстаяння. У творы А. Длатоўскай у бойку ўмешваецца сам Пярун і нагадвае, што яго ваяры павінны падтрымліваць раўнавагу паміж людзьмі і нячысцікамі, а не «бесперапынна знішчаць адных, ратуючы іншых» [15, с. 200].

У аповесці М. Шабанец «Пасланцы Цмока» Курганнае княства на чале з князем Дабраводам хоча распачаць вайну супраць Дрыгвяного княства — уладарства мудрага Цмока — дзе ў паразуменні і згодзе жывуць людзі і міфалагічныя персанажы (вадзянік, жэўжык, лазавік, аржавеннік, пушчавік, зазоўка, расамаха і інш.). Адны міфалагічныя персанажы ставяцца да людзей прыхільна, другія — недобразычліва, паўстаюць самаўпэўненымі і здатнымі пакрыўдзіць слабейшых. Жыхары Курганнага княства распускаюць чуткі, што нелюдзі вінаваты ў выбухах страшнай смяротнай хваробы, таму «шмат хто ідзе ў горад з надзеяй адпомсціць ці абараніць родных…, біць клятых нелюдзяў» [17, с. 102]. Князёўна Люта, Зіхцінка, Уцей, дабрахожы Рыхташ і хіхітун Лерык выпраўляюцца ад Цмока да Дабравода, каб папярэдзіць канфлікт.

Героі аповесці Н. Ясмінскай «Заклінальнік аднарогаў» — людзі, бурвалакі, магі, чарадзеі, людабойцы, аднарогі, цмокі, нільсэ. Адны з міфалагічных істот схільныя падтрымліваць зло, другія — дабро. Цэнтральны сюжэтны матыў твора — змаганне паміж хлопцам Адрыянам і Крывым Чалавекам. Галоўны герой трапляе пад уладу людабойцаў, якія трымаюць яго ў каменнай вязніцы. Хлопец уцякае адтуль і пры дапамозе эльфаў ратуе ад Крывога Чалавека аднарогаў, цмока, сваіх сяброў і нават схаваную ў крыштальным куфры магутнасць эльфаў [18].

Такім чынам, у большасці разгледжаных твораў супрацьстаянне адбываецца паміж людзьмі і фантастычнымі істотамі, і толькі ў апошнім гэта канфрантацыя адсутнічае. Побач з матывамі барацьбы і супрацьстаяння прысутнічаюць матывы сяброўства, дапамогі, ратавання, служэння, хваробы, зняволення, падману, здрады.

У аповесцях С. Мінскевіча «Усмешка Жалобнай Каралевы, альбо Таямніца магнітнага замка», М. Шабанец «Пасланцы Цмока», М. Латышкевіч «Трыснёг пад ветрам» не меншае значэнне мае матыў падарожжа. Вандроўка, у якой шмат небяспек, выпрабаванняў, новых знаёмстваў і дзіўных сустрэч, патрэбна, каб героі дасягнулі вызначанай мэты. Доўгае падарожжа дапамагае паразумецца, наладзіць трывалыя стасункі. У творы М. Латышкевіч складаны паход — гэта час, калі галоўная гераіня Эгла пераасэнсоўвае свае жыццё, змяняе стаўленне да князя, якому яна служыць.

Рэпазіторый БарГУ

Творы фэнтэзі маюць захапляльны авантурны сюжэт, у іх нярэдка прысутнічаюць іронія і гумар. Больш таго, галоўнымі для герояў з'яўляюцца духоўныя каштоўнасці. Таму фэнтэзі — гэта найбольш папулярны сучасны жанр, дзе высакародства, сумленнасць, шчырасць і спагадлівасць пазіцыянуюцца як найважнейшыя якасці. У рамане-казцы А. Жвалеўскага і Я. Пастэрнак акцэнтуецца ўвага на сяброўстве, у аповесці С. Мінскевіча — вернасці пастаўленай мэце, у М. Латышкевіч — годнасці і прынцыповасці, у А. Длатоўскай — смеласці ў змаганні супраць зла. Героі нярэдка вядуць аскетычны лад жыцця, не вельмі дбаюць пра першасныя патрэбы, бо экзістэнцыйна-асабовая праекцыя існавання чалавека паўстае больш важнай, чым матэрыяльна-прыродная. Большасць герояў вераць у наканаванне і адухоўленасць свету, існаванне вышэйшых сіл. Яны мужна прымаюць зняволенне і паразу, усведамляюць непазбежнасць смерці, у безвыходнай сітуацыі скараюцца перад лёсам. Адпаведна, творы фэнтэзі не толькі ўздымаюць чытача над будзённасцю, але і сцвярджаюць важнасць духоўнай сферы, спрыяюць самаўдасканаленню, гарманізуюць асобу.

У прааналізаваных творах ёсць адназначна станоўчыя героі, а ёсць персанажы, якія маюць недахопы або зрабілі памылкі ў мінулым. Дабро не з'яўляецца бездакорным. Тое, што герой робіць добрую справу, не значыць, што ён ідэальны. Так, у аповесці Н. Ясмінскай «Заклінальнік аднарогаў» галоўны герой часам прыхарошвае свае прыгоды, хітруе, пазбягае нялюбай працы. Адрыян крытычна ставіцца да сябе, усведамляе, што мае дзве «існасці» — сумленную і крывадушную [18, с. 26], хаця яго хітрыкі нікому асабліва не шкодзяць і толькі дапамагаюць накіраваць справы ў патрэбным рэчышчы. Ён дакарае сябе за гаварлівасць, за тое, што не пазбегнуў спрэчкі, пакрыўдзіў блізкага чалавека. Пісьменніца надае значную ўвагу міжасабовай камунікацыі, канфліктам паміж блізкімі людзьмі і вучыць чытача асэнсаваным паводзінам, увазе да іншых, важнасці гарманічных стасункаў. У аповесці М. Шабанец «Пасланцы Цмока» Люта выпраўляецца ў вандроўку нягледзячы на хваробу і часам паўстае рэзкай, уладнай, патрабавальнай. Злосць надае энергіі, але ўскладняе стасункі.

Вызначаючы асаблівасці жанру фэнтэзі, І. У. Лебедзеў звяртае ўвагу на «этычную кантраснасць дабра і зла» [7, с. 19]. У сучасным беларускім фэнтэзі дабро і зло менш палярныя, чым у народнай казцы. Зламыснасць адмоўных герояў часам мае важкія падставы. Так, нелюдзі ў творах М. Латышкевіч усведамляюць, што раней ці пазней ім давядзецца сысці, саступіць людзям — і з гэтай прычыны збольшага ставяцца да іх варожа. Агрэсіўнасць адмоўных персанажаў можа быць арганічнай — як у драпежных звяроў (цмокі ў творах М. Латышкевіч, Паляндра ў аповесці С. Мінскевіча). Станоўчыя персанажы могуць схібіць, што акцэнтуецца ў творах К. Захарэвіч і А. Длатоўскай. У сітуацыі, калі многім пагражае небяспека, няпроста сарыентавацца, стрымаць эмоцыі і вызначыць «меншае зло». Маючы добрыя намеры, можна зрабіць выбар, які ў далейшым будзе ацэнены як няправільны, і потым адчуваць глыбокую віну.

Пры аналізе матываў барацьбы і супрацьстаяння важнае значэнне мае вынік змагання. Адмоўныя героі М. Шабанец і Н. Ясмінскай гінуць, што сведчыць пра паразу злых сіл. У аповесці С. Мінскевіча адбываецца пераўтварэнне зла: дзякуючы ягадам ядвабніцы ды чароўнаму алею Дроздзіча Жалобная каралева робіцца радаснай і зычлівай, а ейны палац — светлым і ўтульным. Раман-казка А. Жвалеўскага і Я. Пастэрнак мае шчаслівы фінал, бо героі выконваюць місію — вырываюцца са спыненага часу. Яны вырошчваюць два дубы і размяркоўваюць па іх асобна добрыя і злыя сілы. Падчас перамоў з Перуном і Паляндрай высвятляецца, што яны калісьці кахалі адно аднаго. Але «каханне адно — а ўлада — зусім іншае» [11, с. 347]. К. Захарэвіч, А. Длатоўская, М. Латышкевіч сваімі творамі таксама сцвярджаюць непазбежнасць суіснавання дабра і зла. Героі нейтралізуюць зло, пазбягаюць яго ці абмяжоўваюць яго сілу, але знішчыць нячысцікаў, зданей ды цмокаў немагчыма.

**Заключэнне.** Праведзенае даследаванне дазваляе зрабіць выснову, што ўласцівае для фэнтэзі супрацьпастаўленне добрых і злых сілаў актуалізуе матывы вайны, бітвы, пераследу, помсты, зняволення, падману, здрады, хваробы, сяброўства, служэння, дапамогі, ратавання. Не меншае значэнне, чым матыў барацьбы, можа набываць матыў падарожжа.



Рэпазіторый БарДУ

У большасці прааналізаваных твораў цэнтральны канфлікт абумоўлены супрацьстаяннем людзей і фантастычных істот. У творах С. Мінскевіча і А. Длатоўскай апошнія нясуць небяспеку людзям. У аповесці К. Захарэвіч яны, наадварот, паўстаюць аб’ектам агрэсіі. Варожасць паміж людзьмі і фантастычнымі істотамі выяўляецца ў творах А. Жвалеўскага і Я. Пастэрнак, М. Латышкевіч, М. Шабанец.

Аўтары фэнтэзі для падлеткаў сцвярджаюць важнасць такіх якасцей, як высакародства, сумленнасць, шчырасць, таварыскасць. Станоўчыя героі не толькі смелыя і знаходлівыя, яны таксама надзейныя, спагадлівыя, добразычлівыя, часта вераць у наканаванне і адухоўленасць свету, якім кіруюць невядомыя сілы. Сяброўства, вернасць пастаўленай мэце, годнасць і прынцыповасць, непахіснасць у змаганні супраць зла ў сістэме каштоўнасцей гэтага жанру маюць большае значэнне, чым дабрабыт і жыццёвыя выгоды.

Дабро і зло ў фэнтэзі — паняцці больш адносныя, чым у народнай казцы. Адмоўныя персанажы могуць выклікаць спачуванне, некаторыя станоўчыя героі надзелены недахопамі ці памыляюцца ў складанай сітуацыі. У большасці твораў галоўныя героі дасягаюць мэты — перамагаюць ці нейтралізуюць зло, аднаўляюць баланс паміж злымі і добрымі сіламі.

**Спіс цытаваных крыніц**


1. *Аммон, М. У.* Перспектывы развіцця жанру фэнтэзі ў сучаснай беларускай літаратуры / М. У. Аммон // Актуальные проблемы филологии : сб. науч. ст. — Гомель, 2011. — Вып. 4. — С. 10—13.
2. *Пятроўская, Т. М.* Нацыянальная ідэнтыфікацыя падлеткавых аповесцяў А. Жвалеўскага і Я. Пастарнак / Т. М. Пятроўская // Беларуская мова, літаратура, культура і свет: праблемы рэпрэзентацыі : зб. навук. арт. па выніках Міжнар. навук. канф., Мінск, 15—16 ліст. 2018 г. — Мінск : МДЛУ, 2021. — С. 197—201.
3. *Крылова, М. Н.* Есть ли сегодня хорошая детская книга? Произведения для детей А. Жвалевского, Е. Пастернак / М. Н. Крылова // Метеор-Сити. — 2017. — № 3. — С. 10—17.
4. *Сідарава, Т.* Мастацкія жыццясэнсы М. Латышкевіч / Т. Сідарава // Полымя. — 2022. — № 6. — С. 139—143.
5. *Бреева, Т. Н.* «Русский миф» в славянском фэнтези / Т. Н. Бреева, Л. Ф. Хабибуллина. — М. : Флинта Наука, 2016. — 181 с.
6. *Макарэвіч, А. М.* Беларуская дзіцячая літаратура ў тэрмінах і паняццях : дапаможнік / А. М. Макарэвіч, В. І. Караткевіч. — Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2014. — 140 с.
7. *Лебедев, И. В.* Жанр фэнтези и авантюрно-приключенческая литература / И. В. Лебедев // Rhema. Рема. — 2014. — № 3. — С. 14—20.
8. *Гоголева, С. А.* Другие миры: традиции и типология жанра фентези / С. А. Гоголева // Наука и образование. — 2006. — № 3. — С. 85—88.
9. *Силантьев, И. В.* Поэтика мотива / И. В. Силантьев. — М. : Яз. славян. культуры, 2004. — 296 с.
10. *Томашевский, Б. В.* Теория литературы. Поэтика / Б. В. Томашевский. — М.—Л. : Гос. изд-во худ. лит., 1931. — 241 с.
11. *Жвалеўскі, А.* Гімназія № 13 / А. Жвалеўскі, Я. Пастэрнак. — Мінск : А. М. Янушкевіч, 2017. — 370 с.
12. *Мінскевіч, С.* Усмешка Жалобнай Каралевы, альбо Таямніца магнітнага замка / С. Мінскевіч. — Мінск : Маст. літ., 2013. — 269 с.
13. *Латышкевіч, М. Ю.* Вершнікі на дарозе / М. Ю. Латышкевіч. — Мінск : Чатыры чвэрці, 2022. — 272 с.
14. *Захарэвіч, К.* Час Вогненнага Птушкалова / К. Захарэвіч. — Мінск : Кнігазбор, 2018. — 142 с.
15. *Длатоўская, А.* Арнаменты / А. Длатоўская. — Мінск : А. М. Янушкевіч, 2019. — 201 с.
16. *Криштоп, И. С.* Жанровые особенности экологического романа / И. С. Криштоп // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А, Гуманитарные науки. — 2024. — № 4. — С. 24—27.
17. *Шабанец, М.* Пасланцы Цмока / М. Шабанец. — Мінск : Маст. літ., 2023. — 253 с.
18. *Ясмінска, Н.* Заклінальнік аднарогаў / Н. Ясмінска. — Мінск : Тэхналогія, 2023. — 176 с.


Паступіў у рэдакцыю 22.10.2024.

Репозиторий БарГУ